# ТЭРЫТОРЫЯ, НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШЫ ПЕРЫЯД НОВАГА ЧАСУ

***Урок гісторыі Беларусі, VIII клас***

*Ларыса Валынец*

**Мэты ўрока:** даць характарыстыку тэрыторыі і насельніцтва Беларусі ў першы перыяд гісторыі Новага часу; актуалізаваць пазнавальную актыўнасць вучняў да гісторыі Бацькаўшчыны; развіваць навыкі работы з падручнікам, картай, схемамі; садзейнічаць выхаванню пачуццяў годнасці і любові да сваёй Радзімы.

**Абсталяванне:** карта, падручнік, сшытак, выстава дадатковай літаратуры.

**Ход урока**

**Настаўнік.** Пачаць наш урок я хачу са слоў, якія змешчаны на першых старонках нашых падручнікаў.

| **Гісторыя роднай Бацькаўшчыны** | **Тваё сыны** |
|---|---|
| Ты — векапомная.<br>Ты — гераічная.<br>Ты — драматычная. | К. Астрожскі,<br>Л. Сапега,<br>Т. Касцюшка,<br>Ф. Скарына,<br>С. Полацкі,<br>В. Цяпінскі. |
| **Узбагаціла ты**<br>Усходніх славян — першадрукаром,<br>Еўропу — класічным сярэдневяковым правам,<br>Сусвет — выдатным фальклорам і духоўнасцю. | **Прыцікнем жа да крынічных вытокаў,**<br>Каб памудрэць,<br>Каб пасталець,<br>Каб з годнасцю мовіць:<br>Гэта мы — беларусы! |

**Настаўнік.** У VIII класе мы будзем вывучаць гісторыю Беларусі Новага часу. Давайце ўспомнім:

1. Якія храналагічныя рамкі гісторыі Новага часу?

2. Якія падзеі пачынаюць і завяршаюць гэты гістарычны перыяд?

3. На якія перыяды дзеліцца Новы час?

4. Якія важныя перамены адбыліся ў XVI—XVIII стст. у свеце і ў Еўропе?

Прапаную вам праверыць веды і паўтарыць тое, што вы ўжо ведаеце па гісторыі Беларусі за VI—VII класы. Вазьміце табліцы «Гісторыя Беларусі ў старажытны час і Сярэднявечча». Я буду дыктаваць даты, тэрміны, геаграфічныя назвы і імёны, а вы павінны запісаць гэтыя словы ў адпаведную графу таго гістарычнага перыяду, да якога яны адносяцца.

*862 г., 1410 г., Бердыж, Вільня, Гедымін, Грунвальдская бітва, Ефрасіння Полацкая, крамянёвыя сякеры, крыжакі, Крэўская унія, Лазар Богша, Магдэбургскае права, Міндоўг, Наваградак, неандэртальцы, паляванне на мамантаў, племя, Юравічы, Рагнеда і Рагвалод, Усяслаў Чарадзей.*

Абмяняйцеся сваімі табліцамі і праверце адзін аднаго, выкарыстоўваючы падказку з правільнымі адказамі (на дошцы).

У каго табліца запоўнена правільна, падыміце рукі.

А цяпер мы прадоўжым урок вывучэннем новага матэрыялу.

**План**

1. Знешнія межы і ўнутраны падзел ВКЛ.
2. Навакольны свет.

3. Народы, якія пражывалі на беларускіх землях.

4. Як называлі жыхароў гэтых зямель? А як называлі сябе беларусы?

Вывучэнне гісторыі Беларусі Новага часу мы пачнём з тэмы, якая называецца «Палітычнае становішча ў ВКЛ». Тэма сённяшняга ўрока — «Тэрыторыя, насельніцтва Беларусі ў першы перыяд Новага часу» *(на дошцы запісана тэма ўрока)*.

Звяртаю вашу ўвагу на базавыя лісты кантролю, якія ляжаць на партах. Што з надрукаванага на іх вам вядома? Наша мэта — узбагаціцца ведамі па гісторыі Бацькаўшчыны. Нагадваю, што веды, якія вы атрымаеце на наступных 10 уроках, вы павінны будзеце паказаць на тэставым заліку.

Тым, хто цікавіцца гісторыяй, у працэсе вывучэння тэмы і ўсяго курса, прапаную карыстацца дадатковай літаратурай, прадстаўленай на нашай выставе. Сёння мы пагаворым пра тэрытарыяльныя межы і насельніцтва ВКЛ. На ўроку вы пазнаёміцеся з наступнымі паняццямі: *беларусцы (беларусы), ваяводства, ліцвіны, павет, палешукі, русіны.*

1. Успомніце, калі ўзнікла дзяржава ў Верхнім і Сярэднім Панямонні?

2. Якія тэрыторыі ў XIII—XV стст. мелі назвы «Літва», «Русь», «Жмудзь»? *(Назвы даюцца па чарзе.)*

3. Як адбывалася пашырэнне ВКЛ?

У пачатку XVI ст. ВКЛ — гэта вялізныя абшары Усходняй Еўропы. Яе межы працягваліся ад Берасцейшчыны да Смаленшчыны, ад Балтыкі да Крыма *(Межы паказваюцца на карце.)*

Вельмі важным для нас з'яўляецца тое, што большасць дзяржаўнай тэрыторыі Вялікага Княства складалі ўсходнеславянскія землі, у першую чаргу сённяшнія беларускія, часткова — украінскія і рускія. Балцкія ж землі займалі толькі 1/5 частку Княства. У XV—XVIII стст. ВКЛ падзялялася на ваяводствы, а ваяводствы — на паветы. Карыстаючыся падручнікам (с. 5), вызначце, колькі на Беларусі было ваяводстваў і паветаў. **(6 і 16.)**

Назавіце ваяводствы, якія не падзяляліся на паветы **(Полацкае і Мсціслаўскае.)** А якія падзяляліся на іх? **(Віцебскае, Навагрудскае, Берасцейскае, Менскае.)**

Назавіце паветы, якія, на вашу думку, не ўваходзілі ў беларускія ваяводствы. **(Ашмянскі, Браслаўскі, Лідскі (Віленскае), Гародзенскі — Трокскае.)** Як вы лічыце, у якое ваяводства ўваходзіла Смаргонь?

Ці можаце вы самастойна даць азначэнне паняццям *ваяводства* і *павет*?

*Ваяводства* — адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, на якую падзялялася ВКЛ.

*Павет* — адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, на якую падзяляліся ваяводствы ў ВКЛ.

Падумайце, з якімі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі сучаснай Рэспублікі Беларусь можна параўнаць ваяводствы і паветы?

Пры падрыхтоўцы да ўрока вы падзяліліся на групы, кожная з іх атрымала апераджальнае заданне. Зараз група падарожнікаў раскажа нам пра навакольны свет Беларусі.

**Вучань 1.** Мэтай нашай працы было пацвердзіць думку аб тым, што Беларусь з даўніх часоў называюць краем азёр і лясоў.

**Вучань 2.** Пацверджанне гэтай думкі мы знайшлі ў працах тых людзей, якія жылі на Беларусі або падарожнічалі па ёй у XVI—XVIII стст.

**Вучань 3.** Прапануем паслухаць, як апісвалі прыроду Беларусі картограф Г. Макоўскі, кракаўскі ўрач і гісторык Мацей з Мяхова, мясцовы шляхціч Міхалон Ліцвін.

**Вучань 4.** Добры дзень спадарству! Мяне завуць Г. Макоўскі. У 1613 г. я склаў карту Беларусі і Літвы. І вось што я адзначыў у дадатку да яе... *(Вучань расказвае ўрывак з падручніка «Галасы мінулага» (с. 5) і паказвае на карце рэкі і гарады Беларусі.)*

**Вучань 5.** Дзень добры! Я — Мацей з Мяхова. Маё сапраўднае прозвішча — Мацей Карпіга. Хачу вам паведаміць, што ў сваёй «Хроніцы палякаў», якую я напісаў у 1515—1518 гг., я падымаў пытанне аб паходжанні славянскіх народаў і плямён. Што ж да вашай роднай Беларусі, то пабываўшы тут, я напісаў аб яе жывёльным свеце «Галасы мінулага» *(вучань паказвае малюнкі жывёл на с. 6)*.

**Вучань 6.** А я — мясцовы шляхціч Міхалон Ліцвін, аўтар трактата «Пра норавы татар, ліцвінаў і маскавітаў». Хачу вам сказаць, што ў рэках Беларусі мноства асятроў і іншых вялікіх рыб, якія плывуць з мора ўверх па рэках, у прэсную ваду. З гэтай прычыны многія рэкі называюцца залатымі, асабліва Прыпяць.

**Вучань 1.** Вось такою бачылі Беларусь жыхары XVI—XVII стст.

**Настаўнік.** Дзякуй групе падарожнікаў. А ў мяне пытанне да ўсяго класа: чаму ж Беларусь называлі і называюць краем азёрным, краем лясным?

Скажыце, ці можам мы сёння пахваліцца багаццямі беларускай прыроды? **(І так і не, таму што пагоршылася экалагічная сітуацыя.)**

**Настаўнік.** Беларускую зямлю сёння насяляюць многія народы. Адны з іх — беларусы (нашчадкі балтаў, крывічоў, радзімічаў, дрыгавічоў) — жывуць тут спрадвеку. Другія — прыйшлі сюды па волі лёсу ў розныя далёкія і блізкія часы. Аб тым, якія народы жылі на Беларусі ў вывучаемы намі перыяд, раскажа група этнографаў.

**Вучань 1.** Мэта нашай працы — выявіць, якія народы жылі на Беларусі ў XVI—XVII стст. Вось пра што мы даведаліся...

**Вучань 2.** У сярэдзіне XVI ст. на Беларусі было каля 2 млн чалавек. Вядома, што 80 % тэрыторыі ВКЛ займаў усходнеславянскі этнас. Беларусы жылі тут спакон веку, а ўкраінцы і рускія апынуліся тут па той прычыне, што этнічныя тэрыторыі гэтых народаў былі суседнімі ў дачыненні да Беларусі. Акрамя таго, некаторыя з іх былі заваяваны ВКЛ або добраахвотна ўвайшлі ў яго склад.

**Вучань 3.** Па той жа прычыне жылі на беларускіх землях палякі, літоўцы і латышы. Палякі сустракаліся на Берасцейшчыне і Гродзеншчыне. Усходнелітоўскае насельніцтва — у ваколіцах Ашмян, Шчучына, Ліды, на поўнач ад Гародні. Пасяленні латышоў былі ў Браслаўскім, Дзвінскім і Міёрскім раёнах (*паказвае на карце*).

**Вучань 4.** Акрамя славян і балтаў на Беларусі пражывалі татары, яўрэі і цыганы. Татары і яўрэі былі запрошаны ў ВКЛ яшчэ Гедымінам і Вітаўтам. Татарскае насельніцтва жыло пераважна ў раёнах Клецка, Слуцка, Менска, Іўя, Ліды, Маладзечна. Яўрэйскія абшчыны былі даволі вялікімі ў такіх гарадах, як Бярэсце, Кобрын, Гародня і іншых (*паказвае на карце*).

**Вучань 1.** Варта адзначыць, што ў сталіцы Княства, Вільні, беларусы былі адной з найбольш вялікіх груп жыхароў (*паказвае на карце*).

**Настаўнік.** Паспрабуйце самі зрабіць выснову з таго, што вы пачулі. **(ВКЛ — шматэтнічная дзяржава. ВКЛ — дзяржава шматрэлігійная. Для беларускага народа характэрна такая рыса, як верацярпімасць, або талерантнасць.)**

**Настаўнік.** XV—XVIII стст. — гэта перыяд развіцця ўнутранага рынку ў ВКЛ. У гэты час на Беларусі было больш за 200 рамёстваў. Група акцёраў запрашае вас наведаць беларускі кірмаш, на які з'ехаліся прадстаўнікі розных рэгіёнаў Беларусі. Вызначце, як называлі сябе жыхары беларускіх зямель у XVI—XVIII стст.

**Несцерка.** Добры дзень! Спадзяюся, што вы мяне пазналі. Так, так, я — Несцерка — абавязковы персанаж кірмашу на Беларусі. Зараз мы з вамі даведаемся, хто і адкуль прыехаў на кірмаш.

**Вучань 1.** Прывітанне ўсім! Вітаю і цябе, Несцерка! На кірмаш мы прыехалі з паўночна-заходняй часткі Беларусі. У тагачасных дакументах нашы землі называліся Літвой, насельніцтва нашых тэрыторый называе сябе ліцвінамі.

**Вучань 2.** Тэрыторыя, дзе мы жывём, знаходзіцца на ўсход ад Літвы. Да XVII ст. гэтыя землі зваліся Руссю, а з XVII ст. назва «Русь» стала паступова выцясняцца назвай «Белая Русь». Белая Русь — гэта большая частка Беларусі, тэрыторыя Падзвіння і Падняпроўя. Да XVI ст. людзі, што жылі тут, называлі сябе руссю, русінамі, а ўжо з пачатку XVII ст. мы вызначалі сябе як «беларусцы».

**Вучань 3.** Мы прыехалі на кірмаш з Палесся, з поўдня Беларусі, а завёмся мы палешукамі.

**Несцерка.** Хачу дадаць, што калі я трапляю на кірмашы за межамі Беларусі, то вызначаю сябе як «ліцвін-беларусец са Смаргоні».

**Настаўнік.** Каб лепш запомніць назвы рэгіёнаў Беларусі, звернемся да вытрымкі з дакумента (падручнік, с. 9). Прачытайце яго і назавіце гарады Беларусі, якія знаходзіліся ў Літве, на Белай Русі, на Палессі. Як вы лічыце, на якой тэрыторыі размешчана Смаргонь?

*Адказы дзяцей.*

Перад тым як выставіць адзнакі і даць дамашняе заданне, я хацела б пачуць: які след у вашай душы пакінуў сённяшні ўрок? Што новага вы даведаліся на ім, пра што яшчэ хацелі б даведацца?

*Адказы дзяцей.*